Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис".
ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№50 (236). 13 — 19 снежня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік Наклад 11.300 экз. Кошт 200 руб.

ВЯЧОРКІ ДЛЯ БАЦЬКОЎ

Фота Віталя ГІЛЯ

Выхавацель слонімскага дзіцячага садка №17 Наталля Трус (на здымку) умее не толькі добра працаваць са сваімі маленькімі выхаванцамі, але і вячоркі для іх бацькоў арганізуе, і танчыць — залюбуешся.
(Працяг на 14 стар.)

НАВІНЫ

"СПУТНИК" ПОРОДНИЛСЯ С ВИНЗАВОДОМ

Магазин "Спутник", который находится по ул. К. Давыдюк, присоединили к слонимскому винзаводу.

Как отметил директор винзавода Михаил Окулик, это было сделано для того, чтобы изучать спрос населения на продукцию предприятия. "У завода есть два маленьких магазина, но этого недостаточно. Надо же нам продавать свою продукцию", — сказал Михаил Васильевич.

В планах у новых хозяев — реконструкция магазина, однако, как отметил Михаил Окулик, это дело не одного дня.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗА ПОМОЩЬЮ К МЕДИКАМ

25344 человека обратилось в Слонимское отделение скорой помощи с начала этого года. По информации медиков, за это время из общего числа зарегистрировано 374 безрезультатных (ложных) вызовов.

А вот в прошлом год в скорую помощь поступило 30150 вызовов, из них безрезультатных — 467.

Ольга ШИНКЕВИЧ

АБАРОНІМ СВАЕ ПРАВЫ

10 снежня, у панядзелак, актывісты слонімскага маладзёжнага аб'яднання "Ветразь" раздавалі па навучальным установам горада і раёна памяткі "Што рабіць, калі вас затрымала міліцыя".

Гэта акцыя была прысвечана сусветнаму дню абароны правоў чалавека.

Па словах кіраўніка "Ветразя" Алеся Масюка, слонімскай моладзі такіх памятак было раздадзена каля 5 тысяч экземпляраў.

Вольга ШЫНКЕВІЧ

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 11 декабря 2001г.

	Покупка	Продажа
"Приорбанк"		
1 USD	1565	1610
1 DM	660	715
1 RUR	51	53
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1570	1595
1 DM	690	720
1 RUR	51	53
ОАО "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1560	1600
1 DM	685	715
1 RUR	51	53
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1560	1600
1 DM	650	700
1 RUR	51	53
Нацбанк РБ		
1 EURO	1384.73	

Цены на слонимском рынке по состоянию на 11 декабря 2001г

Продукт	Цена за кг
Гранаты	500 (шт.)
Бананы	1100
Апельсины	1400 — 1500
Яблоки	400 — 800
Киви	250 (шт.)
Помидоры	1500 — 1700
Капуста	300 — 400
Морковь	450 — 500
Лук	600 — 700
Чеснок	1500 — 2000
Картофель	200
Молоко	300
Творог	800 — 900
Масло	3200
Яйца	1500
Свинина	4500 — 5500
Говядина	4500 — 5000
Баранина	4000 — 4500
Сало	3200 —3500
Телятина	4500 — 5000
Мед	5500 — 6000
Сметана	1200
Лимоны	1400
Мандарины	1800 — 2000

ПАВЯЛІЧЫЎСЯ СПІС ПЛАТНЫХ МЕДЫЦЫНСКІХ ПАСЛУГ

Слонімскі гарвыканкам зацвердзіў 21 платную паслугу, якія будуць аказваць насельніцтву мясцовыя медыкі.



Фота IREX/ProMedia

Як сказаў карэспандэнту "ГС" намеснік галоўнага ўрача медаб'яднання Юрый Запрагаеў, некаторыя платныя паслугі нашы медыкі аказвалі і раней. Аб'ём іх за дзевяць месяцаў бягучага года склаў толькі 0,89 % ад усёй колькасці. Сёння да платных медыцынскіх паслуг найперш адносяцца сетка прафілактычных аглядаў, пратэзаванне зубоў, а таксама масажы, ультрагукавыя абследванні, эндаскапічнае абследаванне па жаданню кліента. За грошы сёння можна і пламбіраваць зубы. Такая паслуга ў нас ужо ёсць. Платнае пламбіраванне зубоў будзе ўведзена і ў паліклініцы на Энцы, — сказаў Юрый Запрагаеў. Да вышэй пера-лічаных платных паслуг дабавіліся яшчэ медыцынскае абслугоўванне спартыўных і культмасавых мера-прыемстваў, выдача некаторых медыцынскіх даведак, платная медыцынская дапамога замежным грамадзянам. Гэта значыць,— сказаў Юрый Феліксавіч,— што любы жыхар іншай краіны можа ў нас палячыцца, заплаціўшы пэўную суму грошай. А вось хуткую медыцынскую дапамогу мы ім павінны аказваць бясплатна.

Рабочы, які атрымаў траўму на працы, будзе праходзіць курс лячэння за кошт прадпрыемства. Адзінокія пенсіянеры, якія ў стацыянарнай дапамозе не маюць патрэбы, але ў іх цяжкія бытавыя ўмовы, па дамове могуць аформіцца, напрыклад, у Дзераўноўскую бальніцу. На ўтрыманне штомесяц з іх пенсіі будзе вылічвацца 70%. А вось у каго ёсць дзеці, але яны не хочуць глядзець старых, то на гэтае ўтрыманне вылічваецца ўся пенсія. Такая паслуга аказваецца толькі тым людзям, якія ў гэтым адчуваюць патрэбу і маюць жаданне.

Многія пералічаныя платныя медыцынскія паслугі сёння ў слонімскіх бальніцах і паліклініцы аказваюцца бясплатна, — адзначыў Юрый Запрагаеў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Абарона спажыўца

ПРА БОТЫ ЗА 22 ТЫСЯЧЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Перад надыходам халадоў настаўніца СШ №2 Алена Міско купіла на слонімскім рынку ў індывідуальнага прадпрымальніка Галіны Якацук боты за 22 тысячы беларускіх рублёў. Абула іх жанчына тры разы, і адваліўся абцас.

Фота Віталя ГІЛЯ

Алена Збігнеўна зноў накіравалася на рынак. Наіўна спадзявалася, што гандляр заменіць няякасны тавар, але ў адказ пачула: "Мы гарантыі не даем!". Наступнай інстанцыяй, куды боты завялі жанчыну, была падатковая інспекцыя. Там ёй растлумачылі, што ў гарвыканкаме ёсць упраўленне гандлю, грамадскага харчавання, тавараў і паслуг, якое займаецца таксама пытаннямі абароны правоў спажыўцоў. Тады настаўніца накіравалася ў кабінет № 611 у "белым" доме. Там ёй параілі напісаць заяву аб тым, што здарылася. Жанчына ў той жа дзень, 16 кастрычніка, напісала заяву і пачала чакаць вынікаў. Праз нейкі час Алене Збігнеўне патэлефанавала з названага ўпраўлення інспектар Ірына Іванаўна Раманоўская, якая займалася разглядам заявы і параіла падысці на рынак да Якацукоў (гандляроў мужа і жонкі, якія прадалі няякасны тавар), маўляў, яна з імі пагутарыла, і справа павінна вырашыцца станоўча. Алена Збігнеўна зноў прыйшла на рынак. Галіна Якацук прапанавала адрамантаваць боты за яе кошт. На тым і пагадзіліся. Але, калі прыйшоў час забіраць адрамантаваны абутак, аказалася, што рамонт зроблены абы з рук. Алена Збігнеўна адказалася забіраць свае боты і паведаміла інспектару Ірыне Іванаўне, што такі рамонт яна не прыняла. Інспектар пазваніла настаўніцы 10 лістапада і запэўніла, што на гэты раз пытанне вырашыцца мірна, трэба зноў падысці на рынак. Але калі жанчына проста на рынку абула боты і прайшлася, то адчула, што абцас прымацаваны дрэнна, пра што і паведаміла прадаўцу. Апошняя ж вельмі настойліва прапанавала свайй пакупніцы ўсё ж панасіць іх. І... угаварыла. Дайшоўшы да сваёй школы, жанчына канчаткова зразумела, што насіць гэты абутак немагчыма. Па што назаўтра ж і паведаміла прадаўцу па тэлефоне, спытаўшы, што ж рабіць далей? Якацук спаслалася на тое, што з'язджае ў Маскву, калі вернецца — не ведае. Але пааблаца па вяртанні схадзіць разам да майстра, які рамантаваў абутак, і калі ён скажа, што боты не падлягаюць рамонту, то тады няхай вяртае грошы, а яна, у сваю чаргу, верне іх пакупніцы. Настаўніца, аднак, на такі варыянт не пагадзілася і зноў пайшла са сваімі ботамі ў гарвыканкам у 611 кабінет. Жанчыну прыняў начальнік упраўлення Уладзімір Сарока. Ён пагледзеў на боты і паабяцаў разабрацца. 28 лістапада Алене Збігнеўне зноў патэлефанавала інспектар Ірына Іванаўна і спытала, ці вырашылася яе справа. Гэта здзівіла Алену Збігнеўну, бо яна на працягу двух апошніх тыдняў сама чакала нейкага рашэння з "белага" дома. Аказалася, што ёй званілі, але не засталі на месцы, і што была дамоўленасць з Галінай Якацук, якая павінна была вярнуць грошы за няякасны абутак. 29 лістапада настаўніца накіравалася са сваімі ботамі на рынак, каб памяняць іх на грошы. А там муж Галіны Якацук заявіў, што час абмену — два тыдні — прайшоў, і цяпер жанчына не атрымае ні грошай, ні новых ботаў.

І зноў Алена Збігнеўна звярнулася да інспектара Раманоўскай, і зноў былі абяцанні дапамагчы.

Калі жанчына прыйшла ў рэдакцыю і расказала сваю гісторыю, карэспандэнт "ГС" сустрэўся з начальнікам упраўлення гандлю, грамадскага харчавання, тавараў і паслуг Слонімскага гарвыканкама Уладзімірам Сарокам і пацікавіўся, якое рашэнне з іх боку можа быць прынята па гэтай канкрэтнай справе. Уладзімір Віталевіч паведаміў, што пытанне па гандлю няякасным абуткам індывідуальнага прадпрымальніка Галіны Якацук будзе разглядацца на пасяджэнні гарвыканкама. Рашэнне можа быць прынята самае строгае, ажно да прыпынення дзейнасці пасведчання індывідуальнага прадпрымальніка, калі на працягу двух месяцаў будуць паступаць скаргі ад пакупнікоў.

Такая працэдура прадугледжана заканадаўствам. Уладзімір Сарока адзначыў таксама, што раней асабіста гутарыў з мужам Галіны Якацук і той абяцаў задаволіць прэтэнзіі Алены Збігнеўны Міско, але калі на справе прадпрымальнікі муж і жонка Якацукі павялі сябе зусім па-іншаму, то ёсць спосабы паўздзейнічаць на іх так, што не Алена Збігнеўна будзе за імі бегаць, а наадварот.

Мікола КАНАНОВІЧ

PS. Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, нам стала вядома, што прадпрымальнікі Якацукі вярнулі Алене Міско грошы за боты.

ВЁСКА

БУРОНКІ ДОЯЦЦА НЕ ВЕЛЬМІ

За 10 месяцаў бягучага года ўдой малака ад адной каровы ў сельгасгаспадарках Слонімскага раёна склаў 2083 кілаграмы. Самыя высокія паказчыкі — 2802 кілаграмы на карову — у калгасе "1Мая".

У параўнанні з іншымі раёнамі краіны, Слонімшчына па гэтым паказчыку займае сёлета сярэдняе месца, і ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года малака надаілі больш на 18015 кілаграмаў. А самыя высокія ўдоі ў Беларусі ў Гродзенскім раёне. Там за дзесяць месяцаў ад адной каровы надаілі 3736 кілаграмаў малака. Самыя нізкія — 1335 кг на адну буронку — у Петрыкаўскім. Калі для параўнання ўзяць амерыканскіх кароў, то там фермер не будзе трымаць рагулю, якая дае менш 5000 кг малака ў год, а нормай лічыцца 6 – 8 тысяч кілаграмаў малака ў год ад адной каровы.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ПЕТАРДА ПАКАЛЕЧЫЛА РУКУ

10 снежня вучань 10 класа СШ № 8 г. Слоніма неасцярожна абышоўся з петардай.

У час выбуху яна пашкодзіла яму кісць правай рукі. "Хуткая" даставіла хлопчыка ў паліклініку, дзе яму была аказана медыцынская дапамога.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДАВАРТАВАЛІСЯ

У адзін з вечароў са склада калгаса "Перамога" Слонімскага раёна зніклі ацяпляльныя батарэі, плітка, сантэхніка на агульную суму звыш 1 мільёна рублёў.

Зладзеямі аказаліся не абы хто, а сам вартаўнік з мясцовым калгаснікам, якія праз дах залезлі ў склад. На працягу тыдня іх вылічылі і затрымалі.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДВА ЧЕЛОВЕКА ПОГИБЛИ В ОГНЕ

В ночь с 8 на 9 декабря в деревне Збочно Слонимского района при пожаре погиб 63-летний хозяин дома С.

Причину пожара установит прокуратура. 9 декабря, в воскресенье, в деревне Браково Слонимского района загорелся жилой дом. Из-за неосторожного обращения с огнем (курение в постели) погиб 54-летний мужчина.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ДЕТСКАЯ ПРЕСТУПНОСТЬ СОКРАТИЛАСЬ

За 11 месяцев текущего года несовершеннолетними было совершено 34 преступления, что на 20 случаев меньше по сравнению с таким же периодом 2000 года.

37 семей за этот период лишили родительских прав, а это на 2 семьи меньше по сравнению с 11 месяцами прошлого года.

Ольга ШИНКЕВИЧ

УГНАЛИ МАШИНУ

В ночь с 7 на 8 декабря неизвестные, пробив стену, влезли в гараж по ул. Коссовский тракт города Слонима.

Оттуда они угнали автомобиль VW-Пассат. Личности угонщиков пока что не установлены.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ОБОШЛОСЬ БЕЗ ЖЕРТВ

За прошедшую неделю, с 3 по 9 декабря, в Слониме произошло четыре дорожно-транспортных происшествия без человеческих жертв.

За этот же период сотрудниками ГАИ было задержано 8 водителей в нетрезвом состоянии.

Ольга ШИНКЕВИЧ

З ЗАЛЫ СУДА

80 МІНІМАЛАК ЗА АДНО СЛОВА

У якасці адказчыка ў гэтай судовай справе, якая разглядалася 21 лістапада, выступаў прызыўнік, а пацярпелым аказаўся начальнік аддзела Слонімскага ваенкамата.

Прызыўнік, мясцовы прадпрымальнік, быў абвінавачаны ў тым, што публічна абразіў начальніка другога аддзела ваенкамата пры выкананні апошнім службовых абавязкаў. Падсудны віну сваю, аднак, прызнаў толькі часткова.

А пачалася непаразуменні паміж прызыўніком і работнікам ваенкамата яшчэ ў 1995 годзе, калі апошняму, па яго словах, прыйшлося "з боем выбіваць даведку аб складзе сям'і прызыўніка".

На той час прызыўнік ужо меў адтэрміноўку ад ваеннай службы па сямейных абставінах. Затым былі яшчэ адтэрміноўкі па стану здароўя, а ў 2000 годзе быў нават выклік у ваенкамат пры дапамозе міліцыі. Тым не менш, дактары прызнавалі маладога чалавека непрыгодным для службы ў войску і давалі адтэрміноўку. Так цягнулася да восені бягучага года. Адтэрміноўкі даваліся, а паміж прызыўніком і афіцэрам, які займаецца прызывам, нарасталі непаразуменне і ўзаемная непрыязнасць. І вось на 16 кастрычніка на 8 гадзін прызыўнік атрымаў павестку з'явіцца ў ваенкамат на медкамісію.

Малады чалавек прыйшоў у 10 гадзін раніцы з просьбай перанесці медкамісію на іншы час, бо ў гэты дзень у яго якраз узніклі неадкладныя праблемы на працы. Аднак што гэта за праблемы, ён раслумачыць не захацеў. І каб тады ваенкаматаўскі работнік ведаў, што на час медкамісіі прызыўнік павінен быў гутарыць з міліцыяй, а пасля і з работнікамі пракуратуры па факту рабавання яго прадпрыемства, то наўрад ці размова паміж імі была б скандальнай.

Аднак збег абставін і ранейшая антыпатыя зрабілі сваё. Прызыўнік кінуў у запале ў адрас афіцэра адно, такое папулярнае ў нашым народзе слова, — "казёл". Па рашэнню слонімскага суда гэта слова каштавала яму 80 мінімалак — 600 тысяч рублёў.

А дактары ўсё ж канчаткова канстатавалі той факт, што скандальны прызыўнік да вайсковай службы ў мірны час непрыгодны.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПОШТА

А ЯКОЕ ГЭТА ЖЫЦЦЁ?

Паважаная рэдакцыя!

Звяртаемся да вас з лістом упершыню, але праблема наша і па-ранейшаму балючая. У газету ўжо звярталіся настаўнікі школ наконт малога заробку і яго затрымкі. Падобная сітуацыя склалася і ў нас, звычайных тэхработнікаў школ. Заробак наш зусім малы, ён складае ўсяго 38 тысяч рублёў. Але і гэтыя грошы выдаюць з вялікай затрымкай і па частках. А ў нас таксама ёсць сем'і, дзеці. Ідзе зіма, дзяцей трэба адзець, абуць, а таксама накарміць.

У нас у краіне кіраўніцтва ўсё гаворыць пра будучае нацыі, пра здаровы лад жыцця. А якое гэта жыццё? Кожны дзень пачынаецца з пытання: ці дадуць сёння заробак, ці яшчэ на пэўны час затрымаюць? Потым думаеш, як далей жыць, як размеркаваць атрыманыя грошы: ці то даўгі аддаць, ці то заплаціць за камунальныя паслугі, ці то купіць адзенне-абутак, ці патраціць рублі на прадукты?

У вялікіх гарадах чалавек можа дзе-небудзь падзарабіць, а ў Слоніме і так працы не хапае. Вельмі крыўдна і балюча, што ў нас не думаюць пра людзей, якія працуюць і хочуць працаваць.

Тэхработнікі сярэдніх школ № 8 і № 3

Рэпартаж

МЕРЗНУЦЬ ПЕНСІЯНЕРЫ І ІНВАЛІДЫ

"Мы тут замярзаем", — такімі словамі сустрэлі карэспандэнтаў "ГС" жыхары вуліцы Мінскі тракт у Слоніме. Справа ў тым, што дамы з цэнтральным ацяпленнем ад слонімскага ДЭУ-191 з пачаткам халадоў зусім не ацяпляюцца, а трубы і батарэі ацяплення паразмярзаліся.

Фота Віталя ГІЛЯ

Ганна Каралевіч з унучкай

І так атрымалася, што ў гэтых кватэрах жывуць, у асноўным, пенсіянеры і інваліды працы, якія адпрацавалі ў тым жа дарожным упраўленні і на іншых прадпрыемствах горада па 30 і болей гадоў. Цяпер, замест заслужанага адпачынку, гэтыя старыя і хворыя бабулі пішуць лісты ў Адміністрацыю Прэзідэнта, ходзяць на паклон да мясцовых уладаў, каб яны неяк паспрыялі вяртанню цяпла ў іх дамы. Бо жыць у холадзе для старых і нямоглых людзей у прамым сэнсе падобна смерці. А тым часам трэба жыць. Для пенсіянерак Вольгі Гундар, Марыі Бабровай, Алены Румянцавай, інваліда працы і колішняга перадавіка вытворчасці Валянціны Барысік і многіх іншых жыхароў гэтай вуліцы адзінай крыніцай цяпла з'яўляюцца старыя печкі, якія патрабуюць рамонту, як і іх жыллё. Ды для печак патрэбны дровы. А людзям паведамілі, што дамы іхнія не будуць ацяпляцца толькі ў верасні, і жыхары не паспелі назапасіць паліва. Ды і як нарыхтаваць на зіму дроў той жа Валянціне Барысаўне Барысік, калі яна пасля перанесенага інсульту і па хаце з цяжкасцю рухаецца? А грошай на гатовае паліва з пенсіі не набярэшся. Добра, што суседзі не пакінулі адзінокую жанчыну ў бядзе і чым могуць дапамагаюць. А вось у суседняй, трэцяй кватэры дома №81 у Тамары Лашчэўскай — сапраўдная лядоўня, бо там нават і печкі няма. У кватэры Ганны Каралевіч шэсць разоў перавараны стары кацёл "з'ядае" безліч дроў, а цяпла не дае.

Ва ўсіх сваіх бедах жыхары "халодных" дамоў на Мінскім тракце вінавацяць начальніка ДЭУ-191 Барыса Амяльянчыка. Таму карэспандэнт "ГС" звязаўся з ім і папрасіў пракаменціраваць сітуацыю. І вось што вымалёўваецца з расказу Барыса Іванавіча.

Раней уся гаспадарка дарожнага ўпраўлення разам з ведамаснымі жылымі дамамі ацяплялася ад кацельнай фабрыкі гасцінная мэблі. Ды з часам прадпрыемства запрасіла такія грошы за цяпло, што ДЭУ-191 выгадней было адрамантаваць сваю кацельню, што і было зроблена. Але з кожным годам фінансавае становішча дарожнай службы пагаршалася, і ацяпляць жылыя дамы стала для прадпрыемства накладна. Аднак два гады назад выйшла пастанова ўрада аб перадачы ўсяго ведамаснага жылля на баланс камунальных службаў. Для слонімскага ДЭУ-191 выкананне гэтай пастановы магло б стаць рашэннем праблемы. Але прайшло два гады, а з гарфінаддзела, па словах Барыса Амяльянчыка, за цяпло дарожнаму ўпраўленню не было пералічана ні рубля грошай. І зараз у дарожнікаў зусім няма сродкаў на ацяпленне ўжо не свайго жылога фонду.

У выніку, атрымліваецца, што бедныя бабулі засталіся ў сваіх халодных дамах як бы "бясхознымі". І калі да вясны не павымярзаюць, то ў 2002 годзе ім абяцаюць падвесці газ, якім і будзе ацяпляцца іх жыллё.

Мікола КАНАНОВІЧ

Прэм'ера

СЯМ'Я З ЧУЖЫМ ЧАЛАВЕКАМ

У нядзелю, 9 снежня, у Слонімскім беларускім драматычным тэатры адбылася прэм'ера новага спектакля "Сямейны партрэт з чужым" па п'есе рускага драматурга Сцяпана Лабазёрава. Спектакль паставіў галоўны рэжысёр тэатра Віктар Бутакоў.

Фота Віталя ГІЛЯ

Таня (арт. Наталля Шугай), Кацярына (арт. Вікторыя Міхальчык), Цімафей (арт. Уладзімір Навумік), бабка (арт. Тамара Галаванава)

Падзеі ў спектаклі адбываюцца ў расійскай глыбінцы ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя. У звычайную вясковую сям'ю Цімафея і Кацярыны, якія здаюць пакойчык пад "гасцініцу", пасяляецца 25-гадовы Віктар. Ён прыехаў у вёску афармляць клуб. А вось спыніцца часова не было дзе. Таму і выбраў мясцовы халасцяк Міхаіл для Віктара пакойчык у доме гэтай сям'і.

У час засялення госць знаёміцца з гаспадаром, бабкай і прыгожай Таняй, а пасля пытаецца ў Міхаіла:

— Слухай, а колькі гадоў гэтай Тані?

— Навошта табе? — пытаецца Міхаіл.

— Такая дзяўчынка! А чаго ты адразу, сам з ёю, ці што? Ты ж для яе стары!

Міхаіл заславаў, найперш з-за таго, што Таня спадабалася Віктару. Каб неяк падстрахавацца ад будучых блізкіх узаемаадносін, якія б маглі ўзнікнуць паміж Віктарам і Таняй, Міхаіл шэпча бабцы і ўсім астатнім, што іх кватарант нядаўна вярнуўся з дурдому, і каб яны былі з ім вельмі асцярожныя. Ён нават бярэ ў бабкі расніску, што ён іх аб гэтым папярэдзіў. Адначасова кажа і Віктару, што яго падсялілі да псіхаў:

— Не выходзь, не размаўляй і нагул – маўчы. Галоўнае – з дачкою не ўздумай. А то яны такі вэрхал паднімуць...

З гэтага моманту ў сям'і, куды пасяліўся малады чалавек, пачынаюцца прыгоды і праблемы. З іх і атрымалася бытавая камедыя, якая адлюстроўвае ці не сённяшнія будні нашага аднастайнага жыцця. Галоўная гераіня спектакля ў фінале разважае:

"Усе чамусьці бегаюць, крычаць, равуць, атручваць некага збіраюцца, не разумееш, хто цяпер дурань, хто разумны... Відаць, толькі кошак тапіць нам даручаюць...".

У спектаклі "Сямейны партрэт з чужым" шэсць дзеючых асоб, ролі якіх выконваюць Уладзімір Навумік (Цімафей), Вікторыя Міхальчык (Кацярына), Наталля Шугай (Таня), Тамара Галаванава (бабка), Васіль Сявец (Віктар), Сяргей Лішык (Міхаіл). Найбольш удала са сваімі ролямі справіліся артысты У. Навумік, В. Сявец і С. Лішык. На іх і трымаецца ўвесь спектакль.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

ВЯРНУЛІСЯ З ЭКАЛАГІЧНАГА ТУРНІРУ

У Мінску адбыўся Другі адкрыты Рэспубліканскі экалагічны турнір, які праводзіла Міністэрства адукацыі РБ і грамадская арганізацыя "Беларускі зялёны крыж".

У турніры прынялі ўдзел 28 каманд са ўсіх школ, гімназій і ліцэяў рэспублікі. Слонімшчыну ў ім прадстаўлялі каманды з Сялявіцкай і Сянькоўшчынскай сярэдніх школ, а таксама з СШ № 9 г.Слоніма. Найлепш з трох нашых каманд выступілі вучні з Сялявіцкай школы (кіраўнік Сяргей Клёсаў). Яны атрымалі прыз "За самы доўгі шлях да турніру" і прыз "Лепшы апанент", які дастаўся вучаніцы 11 класа гэтай школы Валянціне Зарычук. З двума прызамі прыехалі дамоў і вучні СШ № 9.

Сяргей ЧЫГРЫН

НЯМА ЗАРПЛАТЫ – НЕ БУДЗЕ І ТЭЛЕФОНА

3 кастрычніка 2001 года Слонімскі раённы вузел электроннай сувязі (РВЭС) устанавіў апошні тэрмін на аплату за карыстанне тэлефонам — 25-га чысла бягучага месяца.

Нечакана гэта стала праблемай для многіх жыхароў Слоніма і раёна. Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у разліковым аддзеле РВЭС, ужо падрыхтаваны спісы на адключэнне неплацельшчыкаў за лістапад. Гэта 679 абанентаў у Слоніме і 67 — у Слонімскім раёне.

Чаму так многа? Адказ на гэтае пытанне даволі празаічны — людзям своечасова не плоцяць зарплату, таму шмат хто не паспявае ўнесці грошы за паслугі сувязі да вызначанага тэрміну.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПАДАРУНАК НА КАЛЯДЫ

Не ведаю ўжо, як гэта атрымалася, але эпідэмія нявыплат дакацілася і да навучэнцаў слонімскага СПТВ-129. Не, стыпендыю ім плоцяць спраўна, а вось грошы за ўборку бульбы аддалі дзяўчатам яшчэ не ўсе гаспадаркі раёна.

Цікава, што нават у сельгасупраўленні Слонімскага райвыканкама пра гэта да апошняга часу не ведалі. Завяршыцца па пытанню "бульбяных" грошай прымусіў званок маці адной з навучэнак СПТВ у рэдакцыю "ГС". І амаль адразу пытанне было вырашана станоўча. Выконваючая абавязкі дырэктара СПТВ-129 Вольга Крынчык паведаміла аб стане спраў начальніку сельгасупраўлення Валерыю Гузеню, і той паабяцаў разабрацца з неплацельшчыкамі. Як стала вядома карэспандэнту "ГС", навучэнцам не выплацілі грошай калгасы "Кастрычнік", "Уперад", "Дружба" і унітарнае сельгаспрадпрыемства "Сасноўка".

Валерый КАВАЛЕНКА

ОБЩЕСТВЕННИКИ ВЫШЛИ В ИНТЕРНЕТ

Общественные организации девяти районов Гродненской области — Слонимского, Лидского, Щучинского, Мостовского, Новогрудского и других — подключены к интернету. Основную помощь в этом им оказала общественная организация "Ратуша" из Гродно.

Как отметил в беседе с корреспондентом БелаПАН один из руководителей данного интернет-проекта Андрей Кусельчук, это поможет активистам негосударственных организаций осваивать навыки работы в глобальной сети, развивать инфраструктуру интернета, завязывать отношения, участвовать в различных "электронных" акциях. В ближайшие месяцы должна улучшится и качественная составляющая участия гродненских общественных организаций в интернете.

Геннадий БАРБАРИЧ

ЗЭЛЬВА

СУСЕДКУ ВЫРАТАВАЦЬ НЕ ЎДАЛОСЯ

У вёсцы Манцякі Зэльвенскага раёна адбыўся пажар, у якім загінула мясцовая жанчына.

Пенсіянеры, муж з жонкаю, любілі выпіць. А 25 лістапада, пасля чарговай п'янкі, пакінулі ў доме не толькі пустыя бутэлькі, але і непатушаную папяросу. Ад яе ўзнік пажар. Сусед, убачыўшы агонь, выбіў акно і ўскочыў у дом. Ён паспеў выцягнуць гаспадара дома, а вось суседку выратаваць не ўдалося.

Сяргей ЧЫГРЫН

МАСТЫ

НЕБЯСПЕЧНАЯ ДАРОГА

Самым небяспечным на Мастоўшчыне лічыцца ўчастак дарогі між вёскай Масты Правыя і горадам Масты.

Толькі за апошнія пяць гадоў там здарылася больш за трыццаць дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх дванаццаць чалавек загінулі ды больш за дваццаць атрымалі цялесныя пашкоджанні розных ступеняў цяжкасці.

Антон МАКЕЙ

СТВАРАЕЦЦА АГРАФІРМА

На Мастоўшчыне пачынаецца новы этап аб'яднання калгасаў. У гэты раз райвыканкам паставіў мэту — стварыць аграфірму.

Па папярэдніх звестках у яе павінны ўвайсці калгас імя Адама Міцкевіча, калгас "Новы шлях", Мастоўскі рамонтны завод, які знаходзіцца ў вёсцы Пескі і акцыянернае таварыства "Ніва". Будучае сельгаспрадпрыемства па плошчы будзе займаць чвэрць тэрыторыі раёна. Як сцвярджаюць дасведчаныя супрацоўнікі райвыканкама, аграфірму, магчыма, узначаліць сам старшыня райвыканкама.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВЫЗНАЧЫЛІ ЯШЧЭ АДНУ КАНДЫДАТУРУ

У чарговы раз вызначана кандыдатура на пасаду генеральнага дырэктара ААТ "Мастоўдрэў".

У гэты раз ім стаў прадстаўнік "Белцяжмаша", асноўнага ўтрымальніка акцый прадпрыемства, Аляксандр Анішчанка. Яго прызначэнне павінен зацвердзіць сход акцыянераў ААТ.

Антон МАКЕЙ

СПРАВА СПЫНЕНА

Спынена следчая справа адносна супрацоўнікаў мастоўскай міліцыі, якія напачатку мінулага года пры допыце непаўналетняга Максіма Хандогі нанеслі яму цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Пры гэтым прымянялі спецсродкі. Апошняе дзеянне падпадае пад артыкул 426 частка 3 "перавышэнне ўлады ці службовых паўнамоцтваў з прымяненнем спецсродкаў". Праз дзень у хлопца медыкі выдалілі селязёнку. Следства доўжылася некалькі месяцаў. Затым выдалены орган накіравалі на экспертызу ў Мінск. Адтуль быў атрыманы адказ, што нельга дакладна вызначыць, калі адбылося пашкоджанне.

Зараз мастоўская міліцыя пільна апякае хлопца. Яго затрымлівалі некалькі разоў, а адзін з супрацоўнікаў РАУС прама сказаў яму: "Ты будзеш сядзець".

Язэп ПАЛУБЯТКА

БЛАГОДАРНОСТЬ

Выражаем сердечную благодарность коллективу травматологического отделения, а именно: заведующему отделением Барановскому Ю.М., лечащим врачам Пискун В.В. и Халупко Ю.К., медицинским сестрам Денискиной Т.А. и Болкунец Т.Н., перевязочной санитарке Касперович Н.М. за профессиональное лечение и чуткое и внимательное отношение.

Дай Бог вам здоровья и благополучия.

Семья Воробьёвых.

Пра людзей харошых

КВЕТКІ ВЯРНУЛІ ЁЙ ЖЫЦЦЁ

— Хочаце верце, хочаце не, але менавіта кветкі вярнулі мяне да жыцця. Быў такі час, калі я думала, што памру. Каварная хвароба настолькі падтачыла арганізм, што я не магла нават выйсці на вуліцу. А калі з вялікай цяжкасцю і ўдавалася зрабіць гэта, то радасці ад прагулак не мела. Ды і дактары, уласна кажучы, не абнадзейвалі, — кажа Марына Аркадзеўна Якшэвіч з Дзятлава.

І вось я нейкім цудам дажыла да вясны.

— Вазьму дачу і пасею кветкі, — нечакана аб'явіла сваім дамашнім.

— Якую дачу?! Якія кветкі?! — жахнуліся яны. — Ды ты ж з цяжкасцю на вуліцу выходзіш, а там працаваць трэба ад рання да змяркання.

— Я так вырашыла! — быў кароткі адказ.

Дачу ёй далі. І першае, што яна там пасеяла, была не цыбуля, не бульба ці якая іншая гародніна. Гэта былі кветкі. І чыстае гаючае паветра, пасільная праца на зямлі, ад якой, здавалася, зыходзіла нейкая чароўная сіла, зрабілі неверагоднае: Марына Аркадзеўна адчула сябе лепш.

Яна садзіла свае гладыёлусы, хрызантэмы, астры і многія іншыя кветкі не градкамі і плантацыямі, як робяць гэта іншыя ўладальнікі дачных участкаў. У яе кветкі перамяжоўваліся з агароднінай, запаланілі сад. На дачы Якшэвічаў з'явіліся такія кветкі, пра якія ў нашых мясцінах нават і не чулі.

— Я выпісвала іх з розных куткоў Беларусі і Прыбалтыкі, абменьвалася са знаёмымі. Ды і сама пасылала людзям насенне. Добрае насенне, якаснае. Але іншы раз атрымлівала не зусім суцяшальныя адказы:

— Не ведаем чаму, але вашы кветкі ў нас не прыжыліся. Адразу, нібыта, пусцілі карэнні, з'явіліся лісточкі, а потым завялі і прапалі. А хіба ж мы іх не даглядалі, хіба не клапаціліся...

Гэта Марына Аркадзеўна тлумачыць так: магчыма вінаваты і кліматычныя ўмовы, а магчыма і псіхалогія чалавека. Як іншыя людзі не могуць ужыцца паміж сабой, так і кветкі. Ім патрэбна асаблівая любоў і ласка, так бы мовіць, душэўны кантакт. Кветкі трэба любіць. Яны адчуваюць гэта, як чалавек. Можа гэта гучыць некалькі неверагодна, але, тым не менш, я кажу праўду.

Марына Аркадзеўна расказала, што цяпер кветкі яна садзіць не толькі для прыгажосці. Многія з іх папярэджваюць самыя розныя хваробы агародніны і садавіны. Напрыклад, там, дзе расце календула, ніколі не будзе хваробаў бульбы, сакавітай і добраякаснай будзе садавіна. Дзякуючы асобным гатункам кветак, у яе агародзе на памідоры ніколі не нападае фітафтора. Ды і наогул гэтую агародніну заўсёды садзіць без поліэтыленавай плёнкі і не баіцца, што яе пашкодзяць вясновыя замаразкі.

Дадумалася да таго, што з паўночнага боку дачнага ўчастка, там, дзе дзьмуць сцюдзёныя вятры, пасадзіла дубчыкі выдатнай сартавой маліны. І, уявіце сабе, яна абараняе ўсе расліны ад холаду, не дае ім загінуць. Нават калі мароз даволі моцны, раслінам нічога не страшна.

Марына Аркадзеўна кажа, што нядаўна ёй прыслалі з Латвіі дзівосную чырвоную кветку, якая расце паверхамі. Непаўторны выгляд мае. Хоча, каб яна ў яе прыжылася. А яшчэ марыць стварыць аранжэрэю ружаў усякіх сартоў. Ідзеш так па алейцы, а наўкола цябе толькі ружы, ружы, ружы...

Марына Аркадзеўна сказала, што сваю дзівосную любоў да прыроды, да кветак яна хацела б перадаць каму-небудзь з блізкіх. І ўпэўнена, што яе пераемнікам будзе трохгадовы ўнук Дзімачка.

— Так што цудоўная справа, шмат гадоў таму назад распачатая Марынай Аркадзеўнай, будзе мець свой працяг.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Гродно

ИВАНОВСКИЙ ПРИЗНАН ВИНОВНЫМ

Судом Ленинского района города Гродно вынесено постановление об административном наказании заместителя председателя гродненской городской организации БНФ, известного художника Дмитрия Ивановского.

Судьей Сергеем Ярошевичем он признан виновным в организации 29 ноября в сороковую годовщину уничтожения в Гродно древнего храма — костела Фара Витовта — несанкционированного митинга (статья 167—1, часть 2 Кодекса об административных правонарушениях Республики Беларусь). Митинг-реквием прошел на месте, где когда-то стоял храм. Суд постановил подвергнуть Дмитрия Ивановского штрафу в размере 150 минимальных зарплат (около 1.000 долларов США). Примечательно, что в ходе рассмотрения материалов административного дела, состоявшегося накануне, 5 декабря, сам Ивановский, в случае признания вины, просил наказать его административным арестом, в связи с тяжелым материальным положением — он не работает, имеет двух детей. Однако суд решил иначе. В ходе суда были допрошены свидетели с обеих сторон, просмотрена видеозапись событий. Ивановский в своем выступлении обратил внимание, что Гродненский горисполком, в нарушение закона, известил его о запрете мероприятия лишь за сутки до его проведения вместо положенных пяти. А адвокат Олег Куц просил прекратить административное дело, так как мероприятие, состоявшееся 29 ноября, имело черты не митинга, а мемориального мероприятия.

Геннадий БАРБАРИЧ

Гродно

СУД НЕ СОСТОЯЛСЯ ИЗ-ЗА УТЕРИ ДЕЛА

Редактор закрытой недавно негосударственной гродненской газеты "Пагоня" Николай Маркевич был приглашен в суд Ленинского района города Гродно.

Там должно было начаться рассмотрение административного дела в его отношении — за организацию несанкционированного пикетирования в областном центре 19 ноября — против закрытия газеты "Пагоня" (статья 167—1, часть 2 Кодекса об административных правонарушениях Республики Беларусь). Ранее двум журналистам газеты — Павлу Можейко и Анджею Писальнику за участие в пикетировании было вынесено административное предупреждение. Однако судья Дмитрий Демченко так и не приступил к рассмотрению дела — в связи с исчезновением самого предмета рассмотрения. Перерыв стол, шкафы, судья так и не обнаружил административного дела, которое, по его словам, утром он еще видел собственными глазами. Он предложил Маркевичу прийти к нему через несколько часов. Однако и позднее дело не отыскалось.

Николай Маркевич

В беседе с корреспондентом БелаПАН Николай Маркевич сказал, что происходящее весьма символично. "В этой стране при этой власти порядка не было и не будет", — сказал журналист.

Хартия'97

Масты

І Ў РАЙВЫКАНКАМЕ БЫВАЮЦЬ ЗЛАДЗЕІ

Зусім нядаўна мяне выклікалі на адміністрацыйную камісію. Там разглядалася мая справа аб вывешванні абвестак на правядзенне мітынгу ва неўстаноўленых месцах.

Па прыбыцці ў будынак райвыканкама я, дзеля прыстойнасці, вырашыў зняць верхнюю вопратку. А паколькі ў вестыбюлі ў гардэробе ніхто не раздзяецца, а на калідорах вешалкі адсутнічаюць, і справа мелася быць кароткай, то вырашыў пакласці куртку на крэсла побач з кабінетам старшыні райвыканкама. Які было маё здзіўленне, калі сябры адміністрацыйнай камісіі ўсе ў адзін голас запратэставалі: "Украдуць". Я жартам перапытаў:" І сярод вас ёсць такія?" "І наведвальнікі тое могуць зрабіць", — пачуў я ў адказ. Даваліся мне несці апратку ў пакой дэпутатаў, дзе мелася адбыцца паседжанне. Затым камісія ў поўным складзе пажалілася, што супрацоўнікам райвыканкама другі месяц не выплочваюць заробку ды за развешванне абвестак аб правядзенні мітынгу ў абарону рабочых ва неўстаноўленых райвыканкамам месцах спаганула штраф у памеры пяці тысяч рублёў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ДЗЯТЛАВА

ПАЖАР ЗА ПАЖАРАМ

У вёсцы Хадзяўляны Дзятлаўскага раёна адбыўся пажар.

Згарэлі дом і хлеў, якія належалі грамадзяніну Л. У гэты ж дзень загарэлася летняя кухня на вуліцы Чкалава і прыватны дом на вуліцы Лермантава ў Дзятлаве. Пажарныя, якія прыехалі на месца здарэння, выратавалі будынак. Згарэла толькі страха. Прычыны пажараў высвятляюцца.

ГОД ІГНАТА ДАМЕЙКІ

Па рашэнню ЮНЕСКА, 2002 год аб'яўлены годам Ігната Дамейкі (1802— 1889) — славутага вучонага і геолага, якому ў наступным годзе споўніцца 200 гадоў з дня нараджэння.

Нядаўна ў Дзятлава прыязджаў вядучы навуковы супрацоўнік інстытута геалогіі Акадэміі навук РБ Валерый Ярцаў. Ён пабываў у гісторыка-краязнаўчым музеі, наведаў былы маёнтак Жыбартаўшчына, які належаў дзядзьку Ігната Дамейкі, і дзе раней жыў славуты вучоны. Там да гэтага часу захаваўся дом, на падмурку якога зроблены надпіс на польскай мове: "Ігнат Дамейка". У ліпені сюды прыедуць госці з многіх краін свету: Францыі, Польшчы, Літвы і нават далёкай Чылі. Яны наведаюць радзіму Дамейкі — Карэліцкі раён, а таксама былы маёнтак Жыбартаўшчыну і пабываюць у Лідскім раёне, куды некалі Ігнат Дамейка быў высланы пад нагляд паліцыі.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ВОЛКОВЫСК

ПОЛЯКАМ ИЗ ВОЛКОВЫСКА ЗАПРЕЩАЮТ ВЫЕЗЖАТЬ В ПОЛЬШУ

Отдел образования Волковысского района выдал постановление, по которому ученикам, учителям и сотрудникам польской школы № 8 в Волковыске запрещается выезд в Польшу без согласования с местными властями.

В письме за подписью руководителя отдела образования Михаила Матвейчика, направленном директору школы Ричарду Худяко, говорится: "Отдел образования Волковысского райисполкома информирует вас, что всякие контакты с Республикой Польша, целью которых является обмен опытом, должны быть согласованы с областным и районным отделами образования, а также с районным исполнительным комитетом. С 1 декабря 2001 года запрещаются всякие выезды учителей, учеников, административного персонала без соответственного разрешения".

СМОРГОНЬ

ИЗДАТЕЛЬ СУДИТСЯ С РАЙИСПОЛКОМОМ

С апреля 1996 года выходит "Новая газета Сморгони". Тираж этого издания в три раза выше исполкомовской "районки". С июля 2001 года учредитель Ромуальд Улан пытается добиться от Сморгонского райисполкома согласования на размещение редакций двух новых газет.

Они должны выходить в соседних районах — Ошмянах и Островце, но офис новых редакций предполагается на первых порах разместить в действующей редакции в Сморгони. Местный райисполком поначалу просто не хотел согласовывать размещение редакций, позже счел это нецелесообразным. В конце концов, власть перенесла груз ответственности на соседние райисполкомы. Но от этого проблема с открытием газет так и не разрешилась, что и побудило издателя обратиться в суд.

Долги за электроэнергию НЕ УМЕНЬШАЮТСЯ

По оперативным данным, на 1 декабря задолженность потребителей электрической и тепловой энергии предприятиям концерна "Белэнерго" составила 581,6 млрд. рублей (377,7 млн. долларов США в пересчете по официальному курсу на этот день).



Фота Віталі ГЛЯ

Об этом сообщила БелаПАН пресс-секретарь концерна Татьяна Манько. За ноябрь сумма долгов возросла на 30,1 млрд. рублей, или на 5,5 процента.

Как сообщила Манько, в конце ноября во всех облисполкомах прошли совещания по вопросу расчетов субъектов хозяйствования за газ, электрическую и тепловую энергию с участием руководителей концернов "Белэнерго" и "Белтопгаз", а также предприятий-должников. В текущем году уровень оплаты колеблется от 80 процентов в Могилевской области и 81 процента в Минской, до 85,1 процента в Брестской и 87 процентов в Гомельской. Меньше всего платят предприятия и организации, входящие в систему Министерства сельского хозяйства и продовольствия. К примеру, в Гродненской области уровень оплаты составляет 37,2 процента, в Гомельской — 27,8.

По итогам совещаний руководителям субъектов хозяйствования предписано обеспечить полную оплату потребленного газа и неукоснительное выполнение установленных постановлением Совета Министров предельных нормативов использования неденежной формы расчетов за природный газ и электроэнергию. До 10 декабря они должны разработать и согласовать с энерго- и газоснабжающими организациями графики погашения задолженности за энергоносители, имеющейся по состоянию на 1 января 2001 года, предусмотрев погашение не менее 10 процентов задолженности до 31 декабря.

Председатели районных и городских исполкомов обязаны ежемесячно проводить совместные заседания исполкомов, газо- и энергоснабжающих организаций и руководителей предприятий по вопросу обеспечения своевременных расчетов за энергоресурсы, а также исключить случаи вмешательства в действия энерго- и газоснабжающих организаций по ограничению или отключению предприятий-должников.

Кроме того, с 1 декабря отпуск энергоносителей предприятиям и организациям осуществляется в объемах, соответствующих уровню оплаты за предыдущий расчетный период.

За невыполнение руководителями субъектов хозяйствования требований по расчетам за газ и энергию будут инициироваться предложения о привлечении их к персональной ответственности.

Дмитрий ВЛАСОВ

ПРОЩЕНИЯ НИКОМУ НЕ БУДЕТ

Александр Лукашенко на совещании по вопросам работы банковской системы страны предупредил генерального прокурора Виктора Шеймана и председателя Комитета госконтроля Анатолия Тозика о персональной ответственности за наведение надлежащего порядка в банковском секторе страны.

"Прощения тем, кто жирует на людских деньгах и не оказывает никакой помощи народу и государству, не будет", — заключил он.

ВЫРОСЛИ ТАРИФЫ НА ЖИЛИЩНО-КОММУНАЛЬНЫЕ УСЛУГИ

В соответствии с постановлением Министерства экономики проиндексирован ряд тарифов на коммунальные услуги населению.

Как сообщает газета "Звязда", например, ставка оплаты за техническое обслуживание жилища возросла с 11,36 до 11,76 рублей за квадратный метр общей площади. Тарифы на горячее и холодное водообеспечение, на отопление, канализацию, пользование лифтом, а также на вывоз и обезвреживание твердых бытовых отходов — увеличились на 3,7%. На столько же выросла стоимость газообеспечения.

ПРЕЗИДЕНТ УТВЕРДИЛ ПОЛОЖЕНИЯ О ПРОВЕРКАХ

Президент Беларуси Александр Лукашенко своим указом утвердил новые редакции Положения о Совете по координации контрольной деятельности в Республике Беларусь и Порядка организации и проведения проверок (ревизий) финансово-хозяйственной деятельности и применения экономических санкций, сообщают официальные источники.

В комментарии к документу отмечается, что ревизия, плановая проверка одного и того же субъекта предпринимательской деятельности может осуществляться не более одного раза в год.

БелаПАН

ЗАДЕРЖАН РЕЖИССЕР ЗГОЛИЧ

В Минске задержан и помещен в изолятор временного содержания ГУВД Мингорисполкома молодой режиссер-постановщик киностудии "Беларусьфильм" Руслан Зголич.

Его обвиняют в хищении пленки с незавершенной версией фильма "Гости", режиссером которого он сам же и является. С заявлением об исчезновении пленки в милицию обратилось руководство "Беларусьфильма".

Как стало известно БелаПАН, Зголича задержали 5 декабря в 15.40 возле здания киностудии и доставили в УВД Первомайского района Минска. Там режиссера продержали несколько часов. Сотрудники милиции требовали вернуть пленку и лишь после девяти часов вечера начали составлять документы о задержании. После этого Зголич был доставлен в изолятор временного содержания.

За несколько дней до задержания Руслан Зголич рассказал корреспонденту БелаПАН о своем конфликте с руководством киностудии "Беларусьфильм". Полнометражный фильм "Гости", бюджет которого составляет 200 тысяч долларов США, является дебютной работой Зголича.

В картине снимается ряд известных российских и белорусских актеров. По словам режиссера, ситуация накалилась из-за сроков сдачи фильма. "Я почувствовал, что кино получается, и художественный совет также подтверждал хорошее качество отснятого материала", — сказал Зголич. Он просил дополнительное время для сдачи картины, считая, что спешка испортит качество работы. Однако руководство киностудии, по словам Зголича, прибегло к административным мерам: режиссеру был объявлен строгий выговор с предупреждением. Встал даже вопрос о том, чтобы фильм завершал другой режиссер-монтажер. Ситуация обострилась в конце ноября, когда Руслана Зголича перестали пускать в его собственный кабинет на киностудии. Он вынужден был обратиться с заявлением в Министерство культуры и прокуратуру, добиваясь самостоятельного завершения своей работы, однако безрезультатно.

Как стало известно БелаПАН, в связи с рядом нарушений, допущенных сотрудниками милиции при задержании Руслана Зголича, известный адвокат Вера Стремковская заявила устную жалобу и потребовала внести ее в милицейский протокол о задержании. После того как ей было в этом отказано, она заявила отвод следователю Александру Хитеву.

Позже в отношении режиссера-постановщика "Беларусьфильма" Руслана Зголича было возбуждено уголовное дело по подозрению в совершении хищений в особо крупных размерах и хулиганстве. Однако ему была изменена мера пресечения и после двухсуточного задержания в ИВС ГУВД Мингорисполкома (изоляторе временного содержания) Зголича освободили под подписку о невыезде. В ИВС, по его словам, он был избит и поэтому сразу после освобождения направился в судмедэкспертизу для снятия телесных повреждений.

Геннадий БАРБАРИЧ

РЕПРЕССИИ ПРОТИВ НОМЕНКЛАТУРЫ НАБИРАЮТ ОБОРОТЫ

Вчера генеральный прокурор Беларуси Виктор Шейман доложил Александру Лукашенко о результатах работы, проделанной органами прокуратуры за прошедшую неделю.

